Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(79), 2013

*УДК 94:323(470):327(476+438)“19”*

# Польскі вектар расійскай дзяржаўнай палітыкі ў Беларусі ў пачатку XX ст.

В.А. Міхедзька

У артыкуле асвятляюцца асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да польскага насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. Адлюстраваны асноўныя этапы развіцця заканадаўчага рэгулявання становішча польскага насельніцтва, паказаны асабістыя матывацыі прыняцця заканадаўчых рашэнняў. Адзначана, што ў першыя гады XX ст. адбываецца зближэнне ўрадавай адміністрацыі і кансерватыўных польскіх землеўладальнікаў. У выніку скарачэння абмежавальнага заканадаўства адбылося аднаўленне эканамічнага, грамадскага і культурнага польскага ўплыву ў Беларусі, што выклікала новы ўздым антыпольскай рыторыкі ў асяроддзі мясцовай адміністрацыі.
**Ключавыя словы:** палякі, дзяржаўная палітыка, Расійская імперыя, “заходнія ўскраіны”.

The paper highlights the features of the state policy in relation to the Polish population in the Belarusian-Lithuanian provinces of the Russian Empire in the early twentieth century. The main stages of the legislative regulation of the provisions of the Polish people as well as the personal motives of legislative decisions are shown. It is noticed that in the early years of the twentieth century a convergence of government administration and the conservative Polish landowners is exercised. A reduction of the restrictive legislation creates the restoration of economic, social and cultural Polish influence in Belarus, which caused a new upsurge of anti-Polish rhetoric in the local administration.
**Keywords:** Poles, state policy, Russian Empire, “western borders”.

Палітыка Расійскай імперыі на яе заходніх “ускраінах”, у тым ліку і ў Беларусі, прыцягвае значную ўвагу даследчыкаў. Сведчаннем таго ёсць публікацыі апошняга часу расійскіх, заходнееўрапейскіх і амерыканскіх гісторыкаў [1], [2], [3]. Адной з найбольш значных праблем застаецца вывучэнне ўрадавай палітыкі ў дачыненні да польскага насельніцтва “Заходняга края”. Пасля паўстання 1863–1864 гг. яна, як вядома, набыла жорсткі дыскрымінацыйны характар. На працягу дзесяцігоддзяў пасля паўстання ў краі дзейнічала складаная сістэма заканадаўчых абмежаванняў польскага насельніцтва ў гаспадарчым, грамадскім і культурна-рэлігійным жыцці. Асабліва жорсткім абмежавальны рэжым стаўся ў 80-я гг. XIX ст. [4], [5]. Пасля паўстання ў краі ўзмацніўся ўплыў “краёўцаў” – лаялісцкай часткі мясцовага польскага грамадства, што лічыла ўзброенае выступленне трагічнай памылкай. “Краёўцы” шукалі магчымасцей для захавання пальшчызны ў складаным ўзаемадзеянні з расійскай уладай. Мэтай прапанаванага артыкула ёсць разгляд кантэксту расійскай палітыкі і, перад усім, пазіцый мясцовай адміністрацыі да польскага насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст.

Пачатак царавання Мікалая II многімі прадстаўнікамі польскага “зямянства” Паўночна-Заходняга краю быў успрыняты з надзеяй на памякчэнне абмежавальнага рэжыму. Сапраўды, імператар у першыя гады свайго кіравання прадэманстраваў шэраг дабразычлівых крокаў на карысць каталіцкага і польскага насельніцтва “Заходняга края”. Самым значным з іх было скасаванне з 1 студзеня 1897 г. кантрыбуцыйнага грашовага падатку з нерухомай маёмасці, які польскія землеўласнікі плацілі з 1863 г. Указ, засведчыўшы памкненне “ўмацаваць у Заходнім краі расійскую дзяржаўнасць”, падаваў скасаванне падатку як асабістую ласку манарха да польскіх землеўладальнікаў [6, с. 143–144]. Яшчэ аднім сведчаннем “зычлівасці” мясцовыя польскія лаялісты лічылі стрыманую рэакцыю ўладаў на “радыкалізм” і “нягнуткасць” віленскіх каталіцкіх біскупаў Зваровіча, а потым і Э. фон Роппа [7, с. 153–154]. У той жа час, з 1901 г. расійскі урад, узяўшы на ўвагу, што колькасць сялян каталіцкага веравызнання з ліку беларускага і літоўскага насельніцтва “небяспечна” павялічылася, абмежаваў іх ў магчымасцях набыцця зямельнай маёмасці па-

мерамі ў 60 дзесяцін [8, c. 45].

Хуткае пашырэнне і радыкалізацыя антыўрадавага рухуператварыла мясцовых польскіх землеўладальнікаў у натуральных саюзнікаў урада. Мясцовая адміністрацыя прыкладна з 1901–1902 гг. і да канца 1905 г. ўжо не разглядала палякаў як сілу найбольш небяспечную для расійскага панавання ў краі. Польскія землеўладальнікі ўспрымаліся як кансерватыўны асяродак, на які ўрад мог бы абаперціся перад набіраўшым моц сацыяльным рухам [9, арк. 3 адв.], [10, арк. 5 адв., 6]. Віленскі генерал-губернатар П.Дз. Святаполк-Мірскі ў дакладзе Мікалаю II у траўні 1904 г. адзначаў кансерватыўнасць польскіх землеўладальнікаў, якія, на ягоную думку, ператварыліся ў апору расійскага ўрада [11, арк. 7 адв., 60, 63 адв., 100].

Рускія памешчыкі, павелічэння колькасці якіх у краі ўрад дамагаўся з дапамогай абмежавальнага заканадаўства, такую апору ўраду скласці яшчэ не маглі. У масе сваёй яны не гаспадарылі самі ў набытых маёнтках, аддаючы перавагу службе ў Пецярбурзе і ў іншых гарадах. Яны аддавалі маёнткі ў кіраванне ці ў арэнду мясцовым ураджэнцам. Шмат хто з рускіх пакупнікоў набываў зямлю ў спекулятыўных мэтах [12, s. 25]. Як заўважаў П.Дз. Святаполк-Мірскі, “памешчык рускага паходжання… частакроць з’яўляецца драпежнікам зямлі, які ігнаруе ўсе патрэбы ўрада” [11, арк. 10 адв.]. Такім чынам, расійская адміністрацыя ў гэты час бачыла ў збліжэнні з мясцовымі польскімі землеўладальнікамі магчымасць умацаваць свае пазіцыі ў краі. Як аптымістычна сцвярджаў віленскі генерал-губернатар, “…Расія выступае цяпер у дачыненні да сваіх больш цывілізаваных іншародцаў узброенай магутнымі сіламі... наш урад... ужо не сустракае сярод заходніх іншародцаў таго супраціву з боку іх духоўных пачаткаў, які б у мінулы час мог уяўляцца небяспечным” [11, арк. 73 адв., 74].

У снежні 1904 г. царскі маніфест абвясціў перагляд абмежавальнага заканадаўства ў дачыненні да “іншародцаў” [13, c. 1197–1198]. Падставай для такога спрыяльнага для мясцовых палякаў развіцця падзеяў выбітны прадстаўнік мясцовых польскіх лаялістаў І. Корвін-Мілеўскі лічыў самога Мікалая II, “пра якога… усім дзеячам польскім… паўтараў, што калі і маем у цэлай дзяржаве расійскай аднаго сапраўды зычлівага да нас і здольнага чалавека, то гэтым чалавекам ёсць Мікалай II” [12, c. 193]. Па сведчанні І. Корвін-Мілеўскага, асабістая зычлівасць П.Дз. Святаполка-Мірскага дазволіла дамагчыся ўказа Мікалая II ад 1 мая 1905 г., якім былі скасаваны найбольш значныя абмежаванні для палякаў у пазямельнай сферы [7, c. 191]. Польскае насельніцтва “Заходняга края” атрымала права на агульных асновах, без абмежавання ў памерах і тэрмінах, купляць, прымаць у заклад і пажыццёвае ўладанне, арандаваць зямельную маёмасць усіх відаў. Пры тым, што захавалася забарона палякам набываць і арандававаць зямельную маёмасць у асоб іншых нацыянальнасцей, польскія землеўладальнікі хутка навучыліся яе абыходзіць. Тады ж быў абвешчаны дазвол выкладання на польскай мове ў тых мясцовасцях края, дзе “большасць навучэнцаў належала да польскай народнасці” [14, c. 286–287]. Штопраўда, улада ў адказ на гэтыя саступкі патрабавала ад мясцовых палякаў сведчанняў лаяльнасці, якія мелі перад усім сімвалічны характар. Ішло пра іх ўдзел ва ўрачыстых цырымоніях адкрыцця ў Вільні помнікаў М. Мураўёву і Кацярыне II. У першым выпадку ў 1898 г. улады палічылі за лепшае не патрабаваць масавай прысутнасці ўплывовых польскіх дзеячаў, магчыма таму, што асоба М. Мураўёва не карысталася вялікай папулярнасцю ў Пецярбурзе. Аднак на адкрыцці помніка Кацярыне II у верасні 1904 г. ужо былі многія з аўтарытэтных польскіх дзеячаў. Аднак, гэта запатрабавала ад П.Дз. Святаполк-Мірскага значных дыпламатычных намаганняў [7, s. 191]. Вялікае станоўчае ўражанне на мясцовае польскае грамадства, па сведчанні Э. Вайніловіча, пакінуў указ 17 красавіка 1905 г., якім былі скасаваны найбольш значныя абмежаванні ў дзейнасці каталіцкай царквы [12, s. 108–109].

Гэтыя перамены адбываліся на фоне палітычнага крызіса царскай улады. Пачатак думскага перыяду стварыў новыя ўмовы для ўзаемадзеяння расійскай улады і польскага грамадства края. Стварэнне асобных дэпутацкіх груповак у Думе ад польскіх “прывісленскіх” губерняў і ад беларуска-літоўска-ўкраінскіх губерняў было выразным лаялісцкім сігналам. Як адзначаў дасведчаны І. Корвін-Мілеўскі, і ў Дзяржаўнай радзе польская групоўка набыла ў 1906 г. рэпутацыю кансерватыўнага “асяродка палітычнай раўнаўвагі” [7, s. 251].

Вяртанне палітычнага курса да канфрантацыі з палякамі І. Корвін-Мілеўскі звязваў са

зменай асабістага стаўлення Мікалая II: “Нашы варшаўскія мудрацы самі наладзілі яму ў 1907 г. грубіянскі афронт, якога аніводны манарх, асабліва аніводны Раманаў, ані забыцца, ані дараваць не мог” [7, с. 193]. Падчас цырымоніі адкрыцця дзейнасці II Дзяржаўнай Думы польскія дэпутаты, адначасова з фракцыяй сацыял-дэмакратаў, дэманстратыўна адмовіліся ўстаць на знак пашаны да асобы імператара. У выніку, заўважаў пазней І. Корвін-Мілеўскі, “ад той хвіліны зрабілі сабе з зычлівага да гэтага часу Мікалая II непрымірымага ворага…” [7, s. 260].

Відавочна, аднак, што асабістая крыўда Мікалая II толькі ўзмацніла тое агульнае ўражанне небяспекі для расійскага панавання, што стварыла хуткая рэстаўрацыя эканамічнага, грамадскага і культурнага ўплыву палякаў на “заходніх ускраінах” імперыі. Пра гэта з думскай трыбуны і на старонках прэсы ўсё гучней казалі расійскія нацыяналістычныя партыі. Змянілася ў гэтым жа накірунку танальнасць паведамленняў беларуска-літоўскіх губернскіх уладаў.

Яскравым сведчаннем моцнай заклапочанасці расійскай адміністрацыі ўзростам польскага ўплыву ў краі з’яўляецца падрыхтаваная мінскім губернатарам А.Ф. Гірсам «Докладная записка о мерах, могущих укрепить национальное самосознание белорусов и противодействовать их полонизации» [15]. А.Ф. Гірс меў дастаткова значны досвед знаёмства з “заходнімі ўскраінамі”. Грамадзянская служба яго пачыналася з пасадаў павятовага маршалка Ковенскай, а потым Мінскай губерняў, пасля быў кіеўскім губернатарам. Гэты дакумент, які быў створаны ў студзені 1914 г., відавочна ад пачатку меў праграмны характар. Асобны адбітак запіскі пад грыфам “зусім сакрэтна” быў адрасаваны мінскаму губернскаму маршалку А.С. Далгаво-Сабураву. Неабходна адразу зазначыць, што, гаворачы пра “нацыянальную самасвядомасць беларусаў”, А.Ф. Гірс зыходзіў з афіцыйнай канцэпцыі “трыадзінага рускага народу” і меў на ўвазе ўмацаванне менавіта расійскай свядомасці сярод беларускага насельніцтва. У гэтым разуменні сутнасці беларускага пытання і адпаведных задач урада А.Ф. Гірс быў вельмі блізкі да П.Дз. Святаполка-Мірскага.

“Запіска” А.Ф. Гірса пачынаецца з прызнання заслуг М.М. Мураўёва ў стварэнні падмурка для ўмацавання “рускіх пачаткаў” і развіцця “рускай культуры ў краі за кошт польскай”. У гэтым кантэксце мінскі губернатар заўважаў, што скасаванне многіх абмежавальных заканадаўчых норм было заўчасным: “Суцэльны шэраг фактаў сведчыць, што рускі элемент у краі яшчэ недастаткова ўмацаваўся, каб уласнымі намаганнямі адстаяць край для Расіі і для рускай культуры” [15, с. 1]. Праз дзесяць гадоў пасля аптымістычных заяў П.Дз. Святаполк-Мірскага мінскі губернатар сумна канстатаваў: “Як толькі былі скасаваны ўсе забароны… зараз жа выявілася ўся перавага польскай меншасці і ў культурных і ў эканамічных адносінах і недастатковая падрыхтаванасць рускай большасці для супрацьдзеяння польскай гегемоніі ў краі. Польскае жыццё ва ўсіх культурных галінах пачало заўважна перамагаць рускае жыццё…” [15, с. 13]. Дзеля таго, каб “адстаяць край для Расіі”, мінскі губернатар прапаноўваў захаваць старыя, а ў шэрагу выпадкаў – стварыць новыя абмежавальныя нормы ў дачыненні да польскага насельніцтва края і каталіцкага касцёла. Акрамя таго, А.Ф. Гірс лічыў неабходнымі мерапрыемствы, якія, на ягоную думку, мусілі спрыяць развіццю “рускіх пачаткаў” у краі. Сярод найбольшых значных абмежавальных задач, якія стаялі перад урадам, ён вызначаў спыненне дзейнасці сярод беларускага каталіцкага насельніцтва тайных польскіх школ, жорсткі кантроль за рухам зямельнай уласнасці ў краі. Вялікую небяспеку для рускай прысутнасці ў краі губернатар бачыў у паланізацыйным характары дзейнасці мясцовых біскупаў-палякаў і каталіцкіх семінарый, пашырэнні каталіцкага празелітызма. Губернатар А.Ф. Гірс пераконваў урад, што “ў справе паланізатарскай дзейнасці злучаюцца ўсе палякі края незалежна ад стана” [15, с. 7]. Таму, лічыў губернатар, нельга дапускаць “палякаў і католікаў” на пасады, якія забяспечваюць непасрэдны кантакт з народнымі масамі і ўсяляк абмежаваць іх прысутнасць у земскіх установах. Вялікую небяспеку для ўрада губернатар бачыў у фактычным захопе палякамі ўстаноў гарадскога кіравання: “Гарадскія ўправы Заходняга края павінны быць забраныя з польскіх рук… і мусіць быць уведзена курыяльная сістэма выбараў галосных па нацыянальнасцях, рускую большасць сярод галосных патрэбна замацаваць законам” [15, с. 12].

Буйным недахопам папярэдняй “ускраіннай палітыкі” мінскі губернатар лічыў ігнараванне “багатага і ўдзячнага этнаграфічнага матэрыялу, якім з’яўляецца беларускае племя. Ба-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гата адоранае ад прыроды, незвычайна працавітае, цвярозае, несумненна адданае Расіі і Рускаму Пасаду" [15, с. 14]. Заўважым, што такая характарыстыка "беларускага племені" з вуснаў высокага расійскага ўрадоўца выразна адрознівалася ад папярэдняй даўгатэрміновай традыцыі. Мінскі губернатар прапаноўваў рэфармаваць дзейнасць мясцовых настаўніцкіх семінарый і пачатковых школ, павялічыўшы аб'ём выкладання ў іх гісторыі, "асабліва мясцовай", геаграфіі Расіі і рускай літаратуры. На гэтыя навучальныя ўстановы, пераконваў губернатар, "неабходна глядзець не толькі з педагагічнага пункту, але і з пункту гледжання палітычнага, як на адзіны пакуль шлях далучэння найбольш здольных прадстаўнікоў беларускага племені да рускай культуры" [15, с. 15]. Але паўставала праблема забеспячэння навучальных устаноў "правільнымі" падручнікамі. А.Ф. Гірс лічыў такімі творы М. Каяловіча і П. Бранцава, якія з'явіліся яшчэ за мураўёўскім часам і сталіся ўжо бібліяграфічнымі рарытэтамі. Таму ўраду неабходна было паклапаціцца і дапамагчы "мясцоваму рускаму грамадству ў яго памкненні ведаць гісторыю края ў бесстароннім асвятленні" [15, с. 17].

Значным рэсурсам супрацьдзеяння польскім уплывам А.Ф. Гірс ужо традыцыйна лічыў праваслаўную царкву і перад усім прапаноўваў мабілізаваць на барацьбу з "паланізмам" праваслаўныя брацтвы [15, с. 17–19, 23–24].

Сярод прапаноў мінскага губернатара было і стварэнне ў Мінску сельска-гаспадарчага інстытута. Патрэба ў ім тлумачылася неабходнасцю забяспечыць рускіх землеўладальнікаў, недасведчаных у мясцовых умовах гаспадарання, паслугамі рускіх аграномаў: "Недахоп рускіх людзей з аграномічнымі ведамі і адначасова знаёмых з умовамі мясцовай сельскай гаспадаркі надта згубна ўплывае на развіццё ў краі рускага землеўладання, ператвараючы яго часткроць у фікцыю". Як за дзесяць гадоў да таго зрабіў П.Дз. Святаполк-Мірскі, мінскі губенатар прызнаваў: "Рускае дваранства, што набыло ў краі зямельныя маёмасці… належыць да разраду людзей… якія зрэдку маюць магчымасць жыць у сваіх маёнтках і кіраваць імі непасрэдна". У выніку, заўважаў А.Ф. Гірс, у краі распаўсюдзілася з'ява, калі "маёнтак лічыўся ўласнасцю рускага памешчыка, …а фактычна ён знаходзіўся ў руках аканома паляка…" [15, с. 22]. Адначасова А.Ф. Гірс звяртаў увагу ўрада на патрэбы развіцця "рускага землеўладання". На думку мінскага губернатара, мясцовае сялянства не магло стацца асноўным суб'ектам рускай зямельнай уласнасці з-за сваёй "некультурнасці". Як заўважаў губернатар, "разлічваць, што сілы гэтыя можа даць рускае дваранства, нельга… нават у цэнтры Расіі дваранскае землеўладанне пачынае ісці да заняпаду". Таму патрэбна "звярнуцца… да мясцовых рускіх культурных сіл недваранскага паходжання, да праваслаўнага духавенства, якое дала значныя кадры мясцовай рускай інтэлігенцыі…, да рускага чынавенства, сярод якога частка элемента прышлага з цэнтра Расіі, частка ж вылучаная мясцовым насельніцтвам, а таксама да той мясцовай рускай інтэлігенцыі, якая вылучана мясцовым беларускім насельніцтвам, дзякуючы паўвекавой дзейнасці тут рускай школы. Гэта інтэлігенцыя, у асяроддзі якой пераважнай па колькасці групай з'яўляюцца настаўнікі народных і царкоўна-прыхадскіх школ, найбольш прыдатная для стварэння з яе рускіх культурных землеўладальнікаў, з прычыны таго, што яна знаёмая з мясцовымі ўмовамі жыцця і сельскай гаспадаркі і безумоўна варожая да паланізатарскіх тэндэнцыяў палякаў" [15, с. 14].

Такім чынам, прапанаваныя А.Ф. Гірсам захады не выходзілі за межы, вызначаныя калісьці яшчэ М. Мураўёвым. Адзіным параўнальна новым сталася дастаткова высокая ўвага да магчымасцей выкарыстання ў антыпольскім змаганні беларускага насельніцтва. Штопраўда, і тут А.Ф. Гірс падмацаваў свае прапановы аўтарытэтам М. Мураўёва, які быццам быў першы, хто "зразумеў і ацаніў значнасць гэтага багатага этнаграфічнага матэрыяла" [15, с. 15]. Вядома, што зварот да аўтарытэта Мураўёва ў дадзеным выпадку быў больш чым сумніўным, але гэты аргумент А. Гірса магчыма зразумець. Грэблівае стаўленне Мікалая ІІ да беларусаў было вядомае, трэба было падмацаваць свае прапановы выключным аўтарытэтам [16, с. 73].

Такім чынам, ва ўмовах пашырэння і радыкалізацыі грамадскага руху расійская ўлада была вымушана шукаць збліжэння з кансерватыўнымі польскімі элітамі. Наступствам гэтага збліжэння сталася паслабленне антыпольскай рыторыкі і частковае скасаванне абмежаваль-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нага заканадаўства. Аднак хуткае аднаўленне польскімі элітамі сацыяльна-эканамічнага і культурнага лідэрства ў "заходнім краі" выклікаў новы ўздым антыпольскіх настрояў, памкненне рэстаўраваць антыпольскае абмежавальнае заканадаўства і выкарыстаць беларускае насельніцтва ў барацьбе супраць палякаў.

**Літаратура**

1. Долбилов, М.Д. Русский край, чужая вера. Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М.Д. Долбилов. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.

2. Anti-Jewish Violence : Rethinking the Pogrom in East European History. – Bloomington : Indiana University Press, 2011.

3. Бовуа, Д. Гордиев узел Российской империи: власть, шляхта и народ на Правобережной Украине (1793–1914) / Д. Бовуа. – М. : Новое лит. обозрение, 2011. – 997 с.

4. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. – Минск, 1980.

5. Смалянчук, А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Смалянчук. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

6. Об отмене… особого процентного сбора в доход казны с недвижимых имений лиц польского происхождения в девяти западных губерниях // Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3-е. – Т. 17. – СПб., 1900. – № 13899.

7. Korwin-Milewski, H. Siedemdziesąt lat wspomnień (1855–1925) / H. Korwin-Milewski. – Poznań, 1930. – 603 s.

8. Об ограничении принадлежащего крестьянам католического исповедания права приобретения земельной собственности в 9-ти западных губерниях / Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3-е. – Т. 21. – СПб., 1903. – № 19618.

9. Отчет виленского губернатора за 1903 год / Российский государственный исторический архив. – Ф. 1284. – Оп. 194. – Д. 52.

10. Отчет минского губернатора за 1902 год / Российский государственный исторический архив. – Ф. 1284. – Оп. 194. – Д. 98.

11. Отчет виленского генерал-губернатора П.Д. Святополка-Мирского от 20 мая 1904 года // Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 1284. – Воп. 194. – Спр. 136.

12. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia. 1847–1928. Część pierwsza / E. Woyniłłowicz. – Wilno, 1931. – 365 s.

13. О предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка / Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3-е. – Т. 24. – СПб., 1907. – № 25495.

14. О порядке выполнения пункта седьмого именного указа 12 декабря 1904 г. в отношении девяти западных губерний / Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3-е. – Т. 25. – Ч. 1. – СПб., 1908. – № 26163.

15. Докладная записка «О мерах, могущих укрепить национальное самосознание белорусов и противодействовать их полонизации» минского губернатора Гирса // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 60. – Воп. 3. – Спр. 114.

16. Куропаткин, А.Н. Дневник / А.Н. Куропаткин // Красный архив. – 1922. – Т. 2.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 01.04.13

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ